РЭСПУБЛІКАНСКІ ІНСТЫТУТ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ І ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ

Кафедра гісторыі і беларусазнаўства

# ГІСТАРЫЧНЫ ШЛЯХ БЕЛАРУСІ

/Вучэбны дапаможнік для выкладчыкаў/

Аўтар-складальнік
доктар гістарычных навук,
прафесар СТАШКЕВІЧ М.С.

Другое выпраўленнае і дапоўненнае выданне

Мінск - 1995

## П Л А Н

1. Гістарычныя карані і этнічная аснова беларускай народнасці. Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі.

2. Беларусь у складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай.

3. Асаблівасці развіцця беларускіх земляў у межах Расійскай дзяржавы.

4. Станаўленне беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці. Барацьба за рэалізацыю дзяржаўнага суверэнітэту.



Разгляд дадзенай тэмы выклікаецца перш за ўсё неабходнасцю даць навучэнцам цэласнае ўяўленне пра гераічны і цяжкі гістарычны шлях беларускага народа. Здабыванне дзяржаўнага суверэнітэту і выхад Рэспублікі Беларусь на міжнародную арэну узмацняюць значнасць гэтай тэмы. У сувязі з гэтым у свядомасці навучэнцаў трэба абудзіць жывую цікавасць да працэса дзяржаўнай кансалідацыі беларускага народа, яго барацьбы за дзяржаўны суверэнітэт, да эвалюцыі эканамічнага ўкладу, дзяржаўных форм і права на працягу многіх стагоддзяў. Правамернасць такой тэмы відавочная і ў кантэксце пастаноўкі агульных праблем цывілізацыйнага падыходу да вывучэння гісторыі, бо, толькі звяртаючыся да аналізу ўзаемасувязі сацыяльна-эканамічнага, палітычнага, духоўнага жыцця народаў, можна зразумець значэнне падзей шматвяковага гістарычнага працэсу.

Пры вывучэнні дадзенай тэмы ўзнікае шэраг метадычных цяжкасцей, якія звязаны, у першую чаргу, з супярэчлівасцю вучэбнага матэрыялу і адсутнасцю колькі-небудзь цэласнай канцэпцыі гісторыі Беларусі -- ад радавога ладу і да нашых дзён. Сярод вучоных няма адзінства і ў вызначэнні месца беларускага народа ў гістарычным працэсе. Адні сцвярджаюць, што ён не меў сваёй дзяржаўнасці і атрымаў яе толькі ў выніку перамогі Кастрычніцкай рэвалюцыі. На іх думку, гэта быццам бы не давала яму ў поўнай меры рэалізаваць свае магчымасці. Другія, наадварот, ідэалізуюць гістарычнае мінулае беларускага народа, сцвярджаюць, што ён быў спрадвечна абсалютна самастойным у сваім гістарычным выбары, яго эканамічнае, палітычнае і духоўнае жыццё развівалася на аснове каштоўнасцей еўрапейскай цывілізацыі эпохі Сярэднявечча, якая склалася ў IX--XIУ стст.

Якія ж гэта каштоўнасці? Якое значэнне яны могуць мець для разумення пройдзенага беларускім народам шляху? Каб даць адказы на гэтыя нялёгкія і шмат каго хвалюючыя пытанні, неабходна звярнуцца да гісторыі, тым больш што і ў мінулым беларускаму народу даводзілася абараняць сваю незалежнасць, весці барацьбу за сваю самастойнасць, ратавацца ад вернай смерці, зноў адраджацца.

## 1. ГІСТАРЫЧНЫЯ КАРАНІ І ЭТНІЧНАЯ АСНОВА БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАСЦІ. ПЕРШЫЯ ДЗЯРЖАЎНЫЯ УТВАРЭННІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ

Ужо даўно ў гістарычнай навуцы склаўся погляд, што ў сярэдзіне I тыс. н.э. пачалося масавае рассяленне славянскіх плямёнаў на поўдзень і на ўсход Еўропы (асноўнай тэрыторыяй іх жыхарства тады былі землі на захад ад балтаў паміж Эльбай (Лабай) і Віслай, на поўнач ад Карпацкіх гор). На ўсходзе славянскія плямёны рассяліліся на Сярэднім Падняпроўі, на поўдні Беларусі, на Украінскай Валыні. На гэтай тэрыторыі склалася магутнае славянскае ядро, якое з'явілася асновай далейшага рассялення славян ва Усходняй Еўропе. Вучоныя мяркуюць, што менавіта адсюль у сярэдзіне I тыс. н.э. славяне сталі пранікаць у заселеныя балтамі раёны сярэдняй і нават паўночнай Беларусі. Аднак масавае засяленне славянамі гэтай тэрыторыі пачалося ў УШ--IX стст. н.э. Так, гэтым часам археолагі датуюць разбурэнне славянамі населенага балтамі гарадзішча Калочына пад Рэчыцай і ўзнікненне каля яго славянскага неўмацаванага паселішча.

Частка балтыйскіх плямёнаў, што насялялі сярэднюю і паўночную частку Беларусі, пад націскам славян адступіла, але большасць іх засталася і хутка пачала змешвацца са славянамі. Гэты працэс працягваўся некалькі стагоддзяў. Перамога славян была абумоўлена не толькі лепшай іх ваеннай арганізацыяй, але і больш высокім узроўнем гаспадарчага і грамадскага развіцця.

Звесткі аб славянскіх плямёнах утрымліваюцца не толькі ў матэрыялах археалагічных раскопак, але і ў пісьмовых крыніцах -- летапісах. Па іх сведчаннях, славянскія плямёны рассяліліся ў Беларусі такім чынам: палачане -- на Дзвіне каля ракі Палаты, крывічы -- у вярхоўях Дзвіны і Дняпра, дрэгавічы -- паміж Прыпяццю і Дзвіной, радзімічы -- на Сажы, бужане -- на Бузе. У прыватнасці, летапіс "Аповесць мінулых часоў" паведамляе, што ў УШ--IX стст. тэрыторыю Беларусі займалі ў асноўным тры групы славянскіх плямён: дрэгавічы, радзімічы, крывічы.

Якую ж ролю адыгралі ўсходнія славяне ў этнагенезе беларусаў? Ці трэба ўлічваць іх пры вывучэнні працэса фарміравання беларускай народнасці?

Адказ на гэтае пытанне спрабавалі даць шмат якія вучоныя. Большасць з іх разглядалі ўсходніх славян непасрэднымі папярэднікамі беларусаў, этнічнай асновай беларускай народнасці. Так, у дарэвалюцыйны перыяд многія гісторыкі лічылі, што беларусы пайшлі ад крывічоў. Гэты пункт погляду, напрыклад, падзялялі вядомы гісторык Н.І.Кастамараў і інш. У 20-я гады крывіцкую тэорыю паходжання беларусаў падтрымлівалі многія беларускія гісторыкі, этнографы і мовазнаўцы. У прыватнасці, яе адстойвалі В.Ластоўскі, Я.Лёсік, А.Шлюбскі, У.Ігнатоўскі і інш. Тады ж выказвалася прапанова адмовіцца ад назвы "Беларусь", замяніць яе тэрмінам "Крывія", а беларусаў назваць крывічамі. З гэтай тэорыяй вельмі блізка змыкалася так званая волатаўская тэорыя, якую падзялялі шмат вучоных беларусазнаўцаў, такіх як Я.Лёсік, М.Каспяровіч і інш. Сэнс гэтай тэорыі зводзіўся да таго, што асновай беларусаў стала племя волатаў (велетаў), якое насяляла тэрыторыю Беларусі ў старажытнасці.



Аднак былі і такія вучоныя (Я.Карскі, А.Багдановіч, У.Пічэта і інш.), якія лічылі, што продкамі беларусаў з'яўляліся не толькі крывічы, але і такія ўсходнеславянскія плямёны, як дрэгавічы, радзімічы і іншыя, што насялялі тэрыторыю Беларусі ў УШ--IX стст. Яны сцвярджалі, што этнічныя асаблівасці беларусаў сфарміраваліся на аснове гэтых плямёнаў. У сваёй кнізе "Гісторыя Беларусі" (ч. 1), выдадзенай у Маскве ў 1924 г., У.Пічэта пісаў у сувязі з гэтым так: "Падзвінскія і падняпроўскія крывічы, дрэгавічы, часткова драўляне склалі асноўнае ядро беларускай народнасці". Славянскую этнічную аснову ў этнагенезе беларусаў прызнавалі і іншыя вучоныя. Аднак разам з гэтым пры вывучэнні этнічнай тэрыторыі беларусаў шэраг вучоных выказвалі думку аб неабходнасці ўлічваць узаемаадносіны ўсходніх славян з іншымі плямённымі ўтварэннямі, якія насялялі тэрыторыю Беларусі. У гэтай сувязі асаблівае значэнне надавалася ўплыву балцкіх плямёнаў у этнагенезе беларусаў. Сярод савецкіх вучоных гэты пункт погляду найбольш паслядоўна развіваў В.Сядоў, які сфармуляваў тэорыю так званага "балцкага субстрату" як рашаючага фактару фарміравання этналінгвістычных і іншых асаблівасцей беларускай народнасці. І хоць тэорыю "балцкага субстрату" падзяляюць шмат якія сучасныя вучоныя, выходзяць яны ўсё ж з таго, што ўплыў балтаў у працэсе этнагенезу беларусаў адлюстроўваўся не непасрэдна, а праз старажытнарускую народнасць. Шмат вядомых вучоных як дарэвалюцыйнага, так і савецкага перыяду этнагенез беларусаў звязвалі з усходнеславянскімі плямёнамі, што ўваходзілі ў старажыт-

нарускую супольнасць (народнасць), якая склалася ў IX--XIII стст., адначасова ўлічваючы ўплыў на гэты працэс і балтаў.

Бясспрэчна, гэтая канцэпцыя адпавядае навуковай ісціне і гістарычнай рэальнасці. Такім чынам, этнічная аснова балтаў мае славянскія карані. Межы беларускага этнасу, якія складаліся на працягу стагоддзяў, больш шырокія, чым сучасная тэрыторыя Рэспублікі Беларусь.

Як вядома, у перыяд рассялення славянаў у Беларусі асноўнай формай іх аб'яднання з'яўлялася племя, усе члены якога былі свабоднымі, раўнапраўнымі. Вышэйшы орган улады -- народны сход (куды ўваходзіла ўсё дарослае мужчынскае насельніцтва) -- вырашаў важныя пытанні палітычнага і гаспадарчага жыцця, выбіраў правадыроў плямёнаў і савет старэйшын. Побач развівалася і набірала моц і ваенная арганізацыя славян (дружына), якая ва ўмовах асваення новых земель і падпарадкавання суседзяў павялічвала славу і багацце яе правадыроў. Эканамічнае і палітычнае ўзвышэнне славянскай племянной знаці суправаджалася паступовым расколам грамадства на дзве процілеглыя групы (класы): феадалы-землеўладальнікі і залежныя ад іх сяляне. Аднак сэнс таго, што адбывалася, выяўляўся не ў расколе грамадства на класы, а ў тым, што ўнутры яго ўзнікла група лідэраў, якая стварыла новую сістэму каштоўнасцей, прывяла да стварэння асаблівай арганізацыі -- дзяржавы. Як паведамляе летапіс, большую частку тэрыторыі Беларусі ў X ст. займалі Полацкае і Тураўскае княствы. Астатнія землі ўвайшлі ў склад Смаленскага, Чарнігаўскага, Уладзіміра-Валынскага і Кіеўскага княстваў.

Сярод гісторыкаў няма адзінай думкі аб гістарычным значэнні Полацкага княства ў кансалідацыі дзяржаўнага жыцця беларускага народа. З усёй адказнасцю можна сказаць, што на тэрыторыі Беларусі з X па XIII стст. існавала вельмі магутная дзяржава, імя якой Полацкае княства, перасягаўшая па сваіх памерах шмат якія заходнееўрапейскія дзяржавы. У Полацку існавала мясцовая княжацкая дынастыя, правы якой прызнаваліся і захоўваліся на працягу многіх пакаленняў. Імёны яе найбольш вядомых прадстаўнікоў X ст. -- Рагвалод, Рагнеда, Ізяслаў -- неад'емныя ад старажытнай гісторыі Беларусі. Ізяслаў у Полацку трывала зацвердзіў дынастыю Ізяславічаў. Сын Ізяслава Брачыслаў і асабліва яго ўнук Усяслаў Брачыславіч праводзілі самастойную палітыку і фактычна не лічыліся з воляй кіеўскіх князёў. У XI ст. Полацкае княства



стрымлівала націск паўднёварускіх князёў на чале з кіеўскім Ізяславам. У сакавіку 1067 г. на Нямізе адбылася крывавая бітва паміж імі і войскам полацкага князя Усяслава. У гэтай бітве палачане былі разбіты, і Усяслаў з рэшткамі свайго войска быў вымушаны бяжаць. Хутка пад Оршай ён быў схвачаны і пасаджаны ў турму ў Кіеве. У 1068 годзе паўстаўшыя супраць Ізяслава кіяне вызвалілі Усяслава і абвясцілі яго вялікім князем. Аднак з дапамогай польскага войска ён быў выгнаны Ізяславам з Кіева. Пасля гэтага Усяслаў вярнуўся ў Полацк.

Канец XI--XII стст. прайшоў у бесперапынных міжусобных войнах. Знясільваючыя войны цяжарам кладліся на сялян і гараджан Полацкага княства. Тым не менш яно працягвала стабільна развівацца ў сацыяльных і палітычных адносінах. У гэты перыяд у Полацку і некаторых іншых гарадах княства пачаў складвацца палітычны лад, пры якім моц стаў набіраць сход гараджан -- веча. Аб гэтым сведчаць і старажытныя летапісы, запісаўшыя, што палачане "стали управляться вечем, как в великом Новгороде и Пскове, государя над собой не имели". Рашэнне веча было абавязковым для ўсяго насельніцтва Полацка і яго малых гарадоў -- наваколляў ("прыгарадаў"). Аўтарытэт Полацкага княства быў дастаткова вялікім. Сакза з ім шукалі шмат якія старажытнарускія князі. На працягу доўгага гістарычнага перыяду гэта дзяржаўнае фарміраванне вяло незалежную ад Кіева палітыку, будавала эканамічнае і культурнае жыццё, зыходзячы выключна толькі са сваіх мэтаў і мясцовых умоў. Гэта пацвярджаюць і летапісы. З улікам азначанага паўстае пытанне: ці не ўтойваем мы вытокаў самабытнай беларускай народнасці, яе дзяржаўнага жыцця? У гэтай сувязі, відавочна, можна пагадзіцца са сцвярджэннем беларускага гісторыка М. Ермаловіча аб тым, што на аснове крывіцка-дрэговіцкага аб'яднання і адначаснага з ім працэсу асіміляцыі балтаў вырастала новае этнічнае ўтварэнне -- палачане, якія сталі першым праобразам беларусаў. Полацк і яго землі былі асяроддзем пачатковай гісторыі Беларусі.

У X ст. усходнія славяне сталі паступова асвойваць землі верхняга і сярэдняга цячэння Нёману. Летапісы і археалагічныя даныя сведчаць аб тым, што найбольш старажытнымі беларускімі гарадамі тут з'яўляліся Навагрудак (у старажытнасці Наваградак), Ваўкавыск, Гродна (Гародня). У XII--XIII стст. яны ўжо былі цэнтрамі феадальных княстваў. У 50--70-я гады XIII стагоддзя Панямонне стала арэнай жорсткай барацьбы паміж галіцка-валынскімі і

літоўскімі князямі. Для яе вынікаў важнае значэнне мела пазіцыя мясцовых славянскіх феадалаў, улік іх інтарэсаў. Як паведамляе Галіцка-Валынскі летапіс, у 1252 г. у сваёй рэзідэнцыі -- Навагрудку -- каранаваўся і прыняў тытул караля князь Міндоўг. Да гэтага часу ён устанавіў свой кантроль над суседнімі княствамі Полацкай Русі. Карыстаючыся агульнай сітуацыяй, якая склалася пасля нападу татараў на Русь, ён далучае да свайго княства так званую Чорную Русь,якая займала тэрыторыю па праваму прытоку Немана. Ён устанавіў тут сваю ўладу над гарадамі Гродна, Ваўкавыскам. Яго прыхільнікі таксама зацвердзіліся і ў самім Полацку. Сталіцай узнікшай дзяржавы Міндоўг зрабіў Навагрудак. У сярэдзіне XIII ст. яму ўдалося стварыць адзіную дзяржаву, якая паслужыла асновай Вялікага княства Літоўскага. Пасля смерці Міндоўга барацьбу за ўмацаванне дзяржаўнага адзінства Вялікага княства Літоўскага працягваў яго сын Войшалак.

Падпарадкаванне адзінай уладзе невялікіх славянскіх княстваў прыпыніла працэс іх феадальнага драблення. Яно садзейнічала інтэграцыі насельніцтва гэтых княстваў у магутнае дзяржаўнае ўтварэнне, якое дало новы імпульс іх дзяржаўнаму жыццю. Полацкае княства, якое ўвайшло ў Вялікае княства Літоўскае, забяспечыла пераемнасць у развіцці культуры, а потым прыярытэт і дзяржаўнае значэнне беларускай мовы ў новым дзяржаўным утварэнні.

Аднак на працягу шматлікіх дзесяцігоддзяў афіцыйная гістарыяграфія адхіляла багатыя традыцыі беларускага народа эпохі сярэднявечча, не заўважала яго імкнення да дзяржаўнай кансалідацыі. Тым самым яна стварала комплекс непаўнацэннасці цэлага народа.

## 2. БЕЛАРУСЬ У СКЛАДЗЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОУСКАГА І РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ

Скаваная догмамі і прыдуманымі схемамі гістарычная і палітыка-прававая думка стварала міф пра тое, што Вялікае княства Літоўскае было выключна літоўскай дзяржавай, хоць і па займаемай тэрыторыі, і па колькасці насельніцтва, і па войску этнічныя літоўцы складалі ў дзяржаве прыкладна 15--20 працэнтаў. Міфам было сцвярджэнне і аб тым, што быццам бы літоўцы, заваяваўшы беларускія і украінскія землі, устанавілі там не толькі сацыяльны, але і нацыянальны прыгнёт. Гэтую версію найбольш паслядоўна адстойваў беларускі гісторык Л.С.Абецэдарскі. У сваёй кнізе "У святле неабвержаных фактаў" (Мінск, 1969) ён пісаў: "Сутнасць дзяржавы вызначаецца не этнічным складам насельніцтва,не яго мовай, а палітычнай арганізацыяй пануючага класа. Вялікае княства Літоўскае стварылася ў XIII ст. не на тэрыторыі ўласнай Літвы як дзяржава літоўскіх феадалаў". Натуральна, гэты вывад не адпавядае гістарычнай рэчаіснасці. Таму і існуе неадкладная патрэба разбурыць гэтыя старыя ўяўленні і догмы і даць адказ на пытанне: ці мае гістарычныя і юрыдычныя правы Рэспубліка Беларусь лічыць сябе наследніцай і пераемніцай Вялікага княства Літоўскага?



Звернемся да гісторыі. Як сведчаць шматлікія дакументы, ва ўмовах барацьбы з крыжакамі і з пагрозай татара-мангольскага нашэсця ў другой палове XIII ст. узнікла беларуска-літоўская дзяржава (у басейне Нёмана) з цэнтрам у Навагрудку, якая стала ядром моцнай еўрапейскай дзяржавы -- Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага. Шмат якія летапісы пацвярджаюць, што яно ўзнікла па ініцыятыве Літвы, а дакладней у выніку вострай барацьбы літоўскай знаці, якая і падштурхнула Міндоўга збаперціся на Навагрудскае княства ў барацьбе за аб'яднанне заходнерускіх і літоўскіх земляў у адну дзяржаву -- Вялікае княства Літоўскае. Ужо пры вялікім князі Гедыміне (час княжання -- 1316--1341 гг.) большая частка тэрыторыі сучаснай Беларусі з'яўлялася складанай часткай Літоўскай дзяржавы. На яе тэрыторыі жылі як славяне, так і літоўцы. Працэс славянізацыі балцкага элемента працягваўся аж да XVI ст. і паступова ахапіў раёны, якія мяжуюць зараз з Літоўскай рэспублікай, а таксама Вільна (Вільнюс) і Віленскі край. Толькі ў сярэдзіне XV ст., канчаткова вызваліўшыся ад уладальніцтва нямецкіх крыжакоў (1410 г., Грунвальдская бітва), да Вялікага княства Літоўскага далучыліся Жамойція (Жмудзь), сучасная тэрыторыя Літвы на захад ад Вільнюса і Каўнаса. Пры ўтварэнні гэтай дзяржавы, у моц значнага развіцця феадальных адносін, а таксама распаўсюджвання хрысціянства (а літоўцы да 1387 г. заставаліся апошнім язычніцкім народам у Еўропе) беларуская культура і мова сталі ў ёй пануючымі. Такім чынам, наколькі ў галіне палітыкі ініцыятыва знаходзілася ў руках літоўскіх князёў, настолькі адваротнай была сітуацыя ў галіне эканомікі і культуры. У гэтых галінах актыўнасць належыла этнічнаму насельніцтву заходнерускіх земляў, прычым у галіне ідэалогіі вяду-

чую ролю адыгрывалі праваслаўныя царкоўныя цэнтры.

Панящце Вялікае княства Літоўскае, Рускае, Жамойцкае сфарміравалася ў першай палове XV ст. і выкарыстоўвалася для падтрымання годнасці вялікага князя. Гэты тытул спачатку самавольна (яшчэ ў 1322 г. Гедымін у падрыхтаваным пры яго двары лісце да папы рымскага называў сябе "каралём літвінаў і многіх русінаў"), а з 1401 г. законна насіў спачатку Вітаўт, потым Свідрыгайла, Сігізмунд Кейстутавіч, Казімір Ягелонавіч, яго сыны Сігізмунд I Стары і Аляксандр і ўнук Сігізмунда II Аўгуст. У рускіх дакументах яны называліся "гаспадарамі" ці "вялікімі князямі".

Тэрыторыя Вялікага княства Літоўскага фарміравался паступова. У сярэдзіне XIV ст. яна межавала на поўначы з валоданнямі Лівонскага ордэна, а на паўночным усходзе -- з Полацкай зямлёй, на ўсходзе -- з зямлёй Смаленскай і па Дняпру да вусця Прыпяці з Чарнігава-Северскімі землямі, на поўдні -- з Кіеўскімі і Валынскімі да Заходняга Буга, а па Бугу да Гродна на Нёмане -- з Польшчай. Ад Гродна да вусця Нёмана Вялікае княства Літоўскае межавала з валоданнямі Тэўтонскага ордэна. На пачатак XV ст. яно падпарадкоўвала вялікую тэрыторыю ва Усходняй Еўропе. Пад уладай вялікіх літоўскіх князёў аб'ядналіся землі, неаднолькавыя па ўзроўню грамадскага развіцця. Беларускія і украінскія землі, якія называліся Русь, знаходзіліся на ступені развітога феадалізму, між тым як на карэнных літоўскіх землях працэс феадалізацыі яшчэ толькі пачынаўся. Акрамя таго, сама Літва не была сацыяльна згуртаванай: Аўкштайція адрознівалася ад Жамойціі адносна буйным княжацкім і баярскім землеўладаннем і структурай кіравання. Аднак, нягледзячы на складаныя сацыяльныя працэсы, якія адбываліся ў Вялікім княстве Літоўскім, дзякуючы ўмелай палітыцы вярхоўнай улады, у структурах якой супрацоўнічалі найбольш уплывовыя колы рознага этнічнага паходжання і канфесійных поглядаў, яно не толькі змагло абараніць сваю незалежнасць у складаных умовах, але і ператварыцца ў XIV--XVI стст. у адзін з асноўных цэнтраў кансалідацыі заходнерускіх (беларускіх, украінскіх і часткова рускіх) земляў.

Доўгі час сярод гісторыкаў ішлі дыскусіі як называць гэтую дзяржаву. У красавіку 1992 г. на "круглым стале" ў Мінску вядомыя гісторыкі Беларусі і Літвы (удзел прымалі польскія, англійскія і італьянскія гісторыкі) у выніку плённай навуковай



дыскусіі прыйшлі да высновы: дзве суверэнных дзяржавы Рэспубліка Беларусь і Літоўская Рэспубліка з'яўляюцца прамымі пераемніцамі гісторыі Вялікага княства Літоўскага, якое павінна вызначацца як літоўска-беларуская ці аднолькава -- беларуска-літоўская дзяржава, з улікам укладу, які на працягу доўгага часу ўносіў у палітычнае і культурнае развіццё Вялікага княства Літоўскага украінскі этнас. Тым самым было адноўлена тое самае вызначэнне дзяржавы, якое ўжывалі ў сваіх навуковых працах беларускія гісторыкі яшчэ ў 20-я гады. З умацаваннем сталінскага рэжыму гэтае вызначэнне знікла з навуковых прац, а тыя, хто спрабаваў яго адстойваць, былі рэпрэсіраваны.

Вялікае княства Літоўскае, несумненна, было поліэтнічнай (якая складалася не толькі з адной народнасці) феадальнай манархіяй. Дзяржава гэта да сярэдзіны XIV ст. уяўляла сабою сукупнасць паасобных княстваў і ўдзелаў і з'яўлялася свайго роду федэрацыяй. У XV ст. Вітаўт скасаваў шмат якія княствы і ўдзелы, ператварыўшы іх у намесніцтвы. Месца апошніх князёў у іх занялі прызначаныя ім намеснікі. У гэты час Вялікае княства Літоўскае дасягнула сваёй найвышэйшай магутнасці. Да яго былі далучаны асобныя воласці Смаленскай і Чарнігаўскай земляў, шэраг іншых малых княстваў. На поўдні Вялікае княства Літоўскае выйшла да Чорнага мора, на поўначы -- да Балтыйскага мора. Пасля уніі з Каронай Польскай у 1569 годзе (Люблінская унія) Вялікае княства Літоўскае апынулася ў складзе Рэчы Паспалітай.

Дзяржаўна-прававы саюз паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польшчай, які працягваўся амаль чатыры стагоддзі, аказаў значны ўплыў на ўсю гісторыю народаў гэтых дзяржаў. Важна адзначыць, што пачатак гэтаму саюзу дало пагадненне , якое было заключана 16 жніўня 1385 г. у замку Крэва, дзе вялікі князь Літоўскі Ягайла прыняў прапанову прадстаўнікоў Польшчы ўзяць шлюб з польскай каралевай Ядвігай і тым самым аб'яднаць дзве дзяржавы пад сваёй уладай.

Умовы Крэўскага пагаднення ў поўным аб'ёме невядомыя. Гістарычныя хронікі паведамляюць толькі пра абяцанні, якія быццам бы Ягайла даў польскім прадстаўнікам. Аднак запіс гэтых абяцанняў, як відаць, падроблены, і па большасці пунктаў яны не былі выкананы. Па ўмовах Крэўскай уніі ў аб'яднанай дзяржаве кароль і вялікі князь спалучаліся ў адной асобе. Кіраўніком дзяржавы абвяшчаўся Ягайла, а потым меркавалася, што выканаўчая ўлада

будзе належыць яго прамым нашчадкам. Уключэнне Вялікага княства Літоўскага ў склад Польшчы азначала ліквідацыю яго дзяржаўнай самастойнасці. У правядзенні сваёй палітыкі Ягайла абапіраўся на буйных феадалаў, якія прынялі каталіцкую веру. Яны атрымлівалі ад Ягайлы розныя прывілеі. Літоўскія феадалы-каталікі сталі апорай Ягайлы ў рэалізацыі Крэўскіх пагадненняў. 18 студзеня 1401 г. на з'ездзе буйныя феадалы, якія прынялі каталіцкую веру, спецыяльнай граматай пацвердзілі саюз Вялікага княства Літоўскага з Польшчай. Праз два месяцы аналагічныя важныя абяцанні пацвердзілі і польскія феадалы, што сабраліся ў Радаме. Гэтыя акты ставілі ў няроўнае становішча феадалаў перш за ўсё беларускіх і ўкраінскіх земляў, спавядаўшых праваслаўе, паколькі дараваныя Ягайлам прывілеі на іх не распаўсюджваліся.

Унія выклікала ў Вялікім княстве Літоўскім рашучае супраціўленне. Барацьбу ўзначалілі полацкі князь Андрэй і гродзенскі -- Вітаўт. У выніку Ягайла і польскія феадалы вымушаны былі адмовіцца ад першапачатковай задумы пагаднення. За Вялікім княствам Літоўскім была захавана самастойнасць, у княстве заставаўся свой урад, казна, войска. Былі адноўлены таксама правы вялікага князя як кіраўніка дзяржавы. У 1404 г. Вітаўт быў прызнаны вялікім князем. Палякам было забаронена набываць землі і сяліцца ў Вялікім княстве Літоўскім. Са свайго боку Вітаўт абяцаў выступіць сумесна з Польшчай супраць знешніх ворагаў. Гэтыя пагадненні дакладна вызначылі сутнасць дзяржаўна-прававой сувязі Вялікага княства Літоўскага з Польшчай як персанальную унію двух дзяржаў пад верхавенствам аднаго гасудара. Пагадненні 1401 г. былі зыходным момантам у аб'яднанні сіл усходнееўрапейскіх народаў у іх барацьбе супраць крыжакоў. Вынікам гэтага стала перамога беларускага, украінскага, рускага, літоўскага і польскага народаў над крыжакамі пад Грунвальдам, якая стала перадумовай поўнага знішчэння Тэўтонскага ордэна. Перамога гэта садзейнічала павышэнню міжнароднага аўтарытэта Вялікага княства Літоўскага і Польшчы, а таксама ўздыму нацыянальнай самасвядомасці славянскіх народаў.

Крэўская унія прынесла і шкоду беларускаму народу: пачалося распаўсюджванне каталіцызму, а разам з ім паланізацыя беларусаў. Гэты працэс працягваўся некалькі стагоддзяў.

Заключыўшы унію з Польшчай, Вялікае княства Літоўскае змагло забяспечыць адносны спакой на заходніх межах дзяржавы. Аднак



ужо ў канцы ХУ -- першай палове ХУІ стст. абвастрыліся супярэчнасці паміж Вялікім княствам Літоўскім і Маскоўскай (Расійскай) дзяржавай. Перш за ўсё гэта было абумоўлена тым, што два гістарычна склаўшыхся цэнтры выступалі як збіральнікі старажытнарускіх земляў у адзіную дзяржаву. Вялікія літоўскія князі рабілі ўсё, каб не даспусціць узмацнення Масквы, а маскоўскія князі заключалі ваенна-палітычныя саюзы, накіраваныя супраць Літвы. І Вялікае княства Літоўскае, і Маскоўская дзяржава, пашыраючы сваю тэрыторыю, у канцы ХІУ ст. сутыкнуліся сваімі межамі. З гэтага часу і пачынаецца саперніцтва паміж імі ў збіранні старажытнарускіх земляў. Часта гэта саперніцтва насіла варожы характар, вылівалася ў войны.

У канцы ХУ -- першай палове ХУІ стст. Вялікае княства Літоўскае вымушана было адступаць пад націскам маскоўскага войска. Няўдачы ў войнах з Маскоўскай дзяржавай, рух за далучэнне да гэтай дзяржавы ў беларускіх землях, антыфеадальныя выступленні сялян ускладнілі ўнутрыпалітычнае становішча ў Вялікім княстве Літоўскім. У гэты час Маскоўская дзяржава прымае адчайныя захады, каб забяспечыць сабе выхад да Балтыйскага мора. Як процідзеянне гэтаму ўзнік саюз Лівонскага ордэна, Польшчы, Вялікага княства Літоўскага. У адказ рускі цар Іван ІУ у студзені 1558 года пачаў вайну супраць Лівоніі. Гэта вайна, атрымаўшая назву Лівонскай, працягвалася да 1583 г. Пад ударамі рускага войска Лівонскі ордэн распаўся і вымушаны быў прызнаць сябе васалам Вялікага княства Літоўскага, у сувязі з чым ваенныя дзеянні перамясціліся на яго тэрыторыю. У 1563 г. пасля асады быў узяты Полацк. Рускаму войску адкрываўся шлях на Вільна (Вільнюс). Пагроза страты беларускіх і ўкраінскіх земляў прымусіла літоўскіх феадалаў пайсці на больш цесны саюз з Польшчай.

У 1569 г. у Любліне быў скліканы сумесны сейм Польшчы і Вялікага княства Літоўскага, на якім было падпісана пагадненне аб уніі. Абедзве дзяржавы аб'ядналіся ў адно цэлае, у адзін дзяржаўны арганізм. Новае дзяржаўнае ўтварэнне атрымала назву -- Рэч Паспалітая. Польскі кароль адначасова станавіўся і вялікім князем літоўскім. Ён насіў тытул "караля польскага і вялікага князя літоўскага і рускага". Улада караля абмяжоўвалася сеймам, які яго выбраў. У сейме былі прадстаўлены як польскія, так і феадалы Вялікага княства Літоўскага. За Вялікім княствам Літоўскім захоўвалася яго назва, права выдаваць мясцовыя законы, мець

унутранае кіраванне і судовыя органы, войска і чаканіць сваю манету. Беларускія землі заставаліся ў складзе Вялікага княства Літоўскага, а украінскія адыходзілі да Польшчы. У тэкст Люблінскай уніі былі ўключаны пункты, якія адмянялі забарону на набыццё польскімі феадаламі зямельных уладанняў на тэрыторыі Вялікага княства Літоўскага. У далейшым гэта дазволіла раздаваць каралю зямельныя пажалаванні польскім феадалам у Беларусі і садзейнічаць пашырэнню ўплыву каталіцызму і паланізацыі феадальнай вярхушкі. Такая палітыка прывяла да абмежавання ад народа вышэйшых слаёў, якія, апалячыўшыся, сталі для яго чужой культурнай сілай.

Рэч Паспалітая як федэрацыя дзвюх дзяржаў -- Польшчы і Вялікага княства Літоўскага і чатырох народаў (беларускага, польскага, літоўскага і украінскага), у сапраўднасці будавалася не па акту Люблінскай уніі (1569 г.), які прадугледжваў стварэнне ўнітарнай дзяржавы, а на аснове практыкі саюзных адносін, што і пачалося з Крэўскай уніі, якія былі замацаваны ў Статуце Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Аднак Вялікае княства Літоўскае паступова губляла свой статус у Рэчы Паспалітай. У другой палове ХУП ст. феадалы Рэчы Паспалітай, напалоханыя размахам вызваленчай барацьбы беларускага і украінскага народаў, узмацняюць нацыянальна-рэлігійны прыгнёт. Правадніком гэтай палітыкі, як і раней, з'яўляўся Ватыкан і ордэн езуітаў. У канцы ХУП -- пачатку ХУШ стст. насільнае распаўсюджванне Брэсцкай царкоўнай уніі ( прынята ў 1596 г.) набыло яшчэ больш шырокія памеры. Законам 1697 г. на тэрыторыі Беларусі і Літвы забаранялася ўжыванне беларускай мовы ва ўрадавых установах. Беларусам дазвалялася пісаць толькі на польскай ці па-латыні. У ХУШ ст. Вялікае княства Літоўскае канчаткова страчвае сваю дзяржаўную самастойнасць. Развіццё Беларусі адбываецца ва ўмовах крызісу Рэчы Паспалітай. Аж да паўстання 1794 г. ідэя нацыянальнай незалежнасці не ўзнікала. І толькі ў ходзе паўстання Найвышэйшая Літоўска-Беларуская Рада, якой падпарадкоўваліся літоўска-беларускія сілы, заявіла аб сваіх прэтэнзіях на самастойнае кіраўніцтва ў Літве і Беларусі. Аднак яе прэтэнзіі былі адхілены польскімі кіраўнікамі паўстання. Адраджэнне Рэчы Паспалітай меркавалася імі ў якасці ўнітарнай дзяржавы.

У выніку дыпламатычных камбінацый і буйных ваенна-палітычных сутыкненняў у Цэнтральнай і Усходняй Еўропе, якія пачаліся ў



апошняй трэці ХУШ ст. і скончыліся падзелам Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі і беларускія землі, аб'яднаныя ў Вялікае княства Літоўскае, яна страціла нацыянальную незалежнасць і была ўключана ў дзяржаўныя граніцы Аўстрыі, Прусіі і Расіі. Беларускія землі, якія з'яўляліся ядром Вялікага княства Літоўскага, увайшлі тады у склад Расійскай імперыі.

Гісторыя, такім чынам, пацвярджае, што дзяржаўныя традыцыі беларускага народа, увасобленыя ў Вялікім княстве Літоўскім, сваімі вытокамі ўваходзяць у еўрапейскую цывілізацыю Сярэднявечча. І хоць сярод вучоных няма адзінства адносна часавых і геаграфічных межаў гэтай цывілізацыі, тым не менш мы будзем мець на ўвазе Еўропу Х--ХУІ стст., куды ўваходзіла і Вялікае княства Літоўскае, асноўным ядром якога былі беларускія землі. Менавіта ў гэты перыяд склаліся асноўныя структуры еўрапейскай цывілізацыі сярэднявечча, якія яшчэ фактычна не былі інтэнсіўна размытыя элементамі новага індустрыяльнага грамадства. У гэтых часавых межах грамадства сярэдневяковай Беларусі было феадальным.

Што ж такое феадалізм? Гэта такі эканамічны лад, у якім уласнікамі зямлі з'яўляліся феадалы, эксплуатаваўшыя залежных сялян.

Вядома, што на працягу ХІУ--ХУ стст. галоўнае багацце Вялікага княства Літоўскага і асноўны сродак вытворчасці -- зямля -- перайшла ва ўласнасць феадалаў -- вялікага князя і шляхты, а таксама царквы і часткова гараджан. Беларускія сяляне, з'яўляючыся асноўнай вытворчай сілай, становяцца толькі землекарыстальнікамі. У залежнасці ад таго, чыёй зямлёй яны карысталіся, сяляне падзяляліся на дзяржаўных (гаспадарскіх) і прыватнаўладальніцкіх. Меліся групы манастырскіх (духоўных) сялян, а таксама групы сялян -- слуг, якія выконвалі розныя сацыяльныя работы (конюхі, рыбаловы, бортнікі, рамеснікі, упраўляючыя гаспадаркай і іншыя). Да сярэдзіны ХУІ ст. у Беларусі панавала абшчыннае землекарыстанне, а пасля ажыццяўлення ў 1557 г. зямельнай рэформы, якая атрымала назву "валочнай памеры", адбылася змена абшчыннага землекарыстання падворным. Сэнс рэформы быў у тым, што кожная сялянская гаспадарка замацоўвалася за часткай валокі (уся зямля феадала падзялялася на роўныя ўчасткі -- "валокі" па 21,3 га). Сяляне станавіліся прыгоннымі. З валокі вызначалася сума розных павіннасцей. Яны былі рознымі для цяглых сялян і асадных

Цяглыя сяляне, напрыклад, павінны былі за кожную валоку працаваць на працягу двух дзён у тыдзень на фальварку феадала, а таксама плаціць аброк аўсом, сенам, хатняй птушкай, уносіць невялікі грашовы чынш і выконваць працоўную павіннасць. Асадныя сяляне абавязаны былі плаціць чынш у памеры ад 66 да 106 грошаў у год. Рэформа садзейнічала замацаванню сялян за зямлёй, а хутка прынятыя статуты 1566 і 1588 гг. устанавілі 20-гадовы тэрмін пошуку збеглых сялян і вяртання іх феадалам, што абазначала юрыдычнае афармленне прыгоннага права ў Вялікім княстве Літоўскім.

У XIУ--XУI стст. адбываецца значны рост гарадоў і гарадскога насельніцтва ў Вялікім княстве Літоўскім. Найбольш буйнымі гарадамі былі Полацк, Віцебск, Магілёў, Мінск, Брэст, Слуцк, Гродна, Навагрудак. Гарады Беларусі, як і гарады Еўропы -- гэта па сутнасці дзяржава ў мініяцюры. Ен змяшчаў у сабе прадстаўнікоў усіх сасловяў. Большую частку насельніцтва гарадоў складалі рамеснікі, якія ў асноўнай сваёй масе былі аб'яднаныя ў цэхі. Цэхі абаранялі грамадскія і палітычныя правы грамадзян, іх уласнасць і права на занятак рамесніцтвам. У горадзе жылі таксама прадстаўнікі знаці і духавенства. Аднак у горадзе яны набываюць новыя якасці -- усе яны былі гараджанамі.

З ростам гарадоў як гандлёва-рамесных цэнтраў гараджане імкнуліся пазбавіцца феадальнай залежнасці і атрымаць права на самакіраванне. З канца XIУ ст. літоўскія князі сталі прадастаўляць гарадам права на самакіраванне падобна да права, якім карыстаўся нямецкі горад Магдэбург. У сувязі з ім у гарадах адміністрацыйным органам з'яўляўся магістрат. Ен складаўся з рады і лавы (суда). На чале рады стаяў войт. У другой палове XУI ст. права на самакіраванне атрымалі амаль усе буйнейшыя гарады Беларусі. Мінску магдэбургскае права было дадзена ў 1499 г. Усталяванне самакіравання ў гарадах Беларусі мела важныя вынікі. Магдэбургскае права давала свабоду гараджанам сярэдневяковай Беларусі, якія асэнсоўвалі сваю індывідуальнасць, з'яўляліся носьбітамі гуманістычных каштоўнасцей.

У Вялікім княстве Літоўскім пануючым класам з'яўляліся феадалы, якія складалі нязначную частку насельніцтва. На вяршыні класа феадалаў стаяў вялікі князь літоўскі ("гаспадар"), вярхоўны ўласнік усёй зямлі ў дзяржаве, меўшы таксама і свае зямельныя ўладанні. Наступную групу складалі буйныя феадалы -- радавітыя князі і магнаты (паны), валодаўшыя на правах уласнасці



зямлёй і цэлымі абласцямі (вотчынамі). Яны мелі права перадаваць зямлю ў спадчыну. У іерархіі феадальнага класа важнае месца належыла баярам, якія былі абавязаны несці службу князю ці буйному магнату. Яны складалі самую шматлікую групу феадалаў. Але сярод іх былі такія, якія валодалі зямлёй па спадчыне, другія ж -- часова, за службу. Апошніх пазней сталі называць шляхтай. Узнікненне шляхты было выклікана не столькі расколам грамадства на класы, колькі ваеннай неабходнасцю. Шматлікія войны, якія давялося весці Вялікаму княству Літоўскаму, узмацнілі ролю ў жыцці дзяржавы дробнай ваеннаслужылай шляхты, якая таксама была і асноўнай апорай вялікага князя ў яго барацьбе з магнатамі. Карыстаючыся гэтым, шляхта ў сярэдзіне XУI ст. паступова здабыла правы спачатку на зямлю і асабістую недатыкальнасць, а потым і на занятце вышэйшых дзяржаўных пасад. Гэтых правоў шляхта дамагалася паступова. Вялікакняжацкімі прывілеямі (ад 2 кастрычніка 1413 г., 6 мая 1484 г., 2 мая 1447 г.) за ёй замацоўвалася права на сялян. Вялікі князь таксама замацаваў за ўладальнікам сялян права іх судзіць.

У Вялікім княстве Літоўскім усе дзяржаўныя пасады раздаваліся толькі яго ўраджэнцам вялікім князем. Ураджэнцы іншых дзяржаў, у тым ліку і польская шляхта, не мелі права займаць якія-небудзь пасады ў Вялікім княстве Літоўскім. Гэтая норма была замацавана і артыкуламі Літоўскага статута 1529, 1566, 1588 гг. Усе гэтыя акты замацоўвалі дзяржаўны лад Вялікага княства Літоўскага, садзейнічалі кансалідацыі вышэйшага яго саслоўя -- феадалаў.

У сацыяльнай структуры феадальнага грамадства асаблівае месца займала духавенства. Гаварыць пра духавенства ў Вялікім княстве Літоўскім як пра саслоўе феадалаў, відавочна, будзе неправамерна. Яно не з'ўлялася саслоўем у звычайным сэнсе, паколькі было адкрытым для ўсіх слаёў насельніцтва. Адбывалася так, што нашчадкі знатнага роду станавіліся простымі манахамі (напрыклад, сын Міндоўга Войшалак), а выхадцы з сялян дасягалі высокіх чыноў у царкоўнай іерархіі. Што ж аб'ядноўвала гэтых людзей? Толькі адно -- усе яны былі ў складзе арганізацыі, якая кантралявала ўсё, што было звязана з ідэалогіяй сярэднявечча -- хрысціянствам.

Гэта было характэрна і для царкоўнай арганізацыі ў Вялікім княстве Літоўскім. Большасць усходнеславянскага насельніцтва ў

княстве прытрымлівалася праваслаўя. У Вялікае княства Літоўскае праваслаўе прыйшло з Полацкай Русі. Іерархічна яно было звязана з Кіеўскім мітрапалітам. У XIУ ст. рэзідэнцыя мітрапаліта была перанесена ў Маскву. Па традыцыі Маскоўскаму мітрапаліту была падпарадкавана праваслаўная царква Літоўска-Беларускай дзяржавы. Аднак з гэтым не хацелі пагаджацца вялікія літоўскія князі. Незалежная палітыка дзяржавы патрабавала самастойнасці і ў царкоўных адносінах. Гэта і падштурхнула Вітаўта ў пачатку XУ ст. склікаць сабор епіскапаў і абраць мітрапалітам Рыгора Цамблака. Тым самым быў паложаны пачатак разрыву іерархічных сувязей Літоўска-Беларускай праваслаўнай царквы з Маскоўскай мітраполіяй. Незалежны стан захоўваўся да 1589 г., гэта значыць да таго часу, пакуль Маскоўскай дзяржаве ўдалося заснаваць у Маскве патрыяршаства, чым юрыдычна зноў праваслаўная царква Вялікага княства Літоўскага была пастаўлена ў іерархічнае падданства Маскве.

У XIУ ст. на тэрыторыі Беларусі пачаў распаўсюджвацца і каталіцызм. Да канца XУI ст. узаемаадносіны паміж праваслаўнымі і каталікамі тут не былі талерантнымі. Вядома, што ў XУI ст. 23 княжацкіх і 42 родных шляхецкіх рода Вялікага княства Літоўскага прытрымліваліся праваслаўнай веры. Аднак з прыняццем у 1596 г. у Брэсце царкоўнай уніі канфесіянальная сітуацыя ў Беларусі змянілася. Царкоўная унія праваслаўную канфесію ў Беларусі паставіла пад духоўную ўладу папы рымскага. Яна дапускала поўнае захаванне праваслаўных традыцый, але пры гэтым патрабавала, каб самі праваслаўныя абавязкова прызнавалі догмы каталіцкай царквы, а сваім кіраўніком -- папу рымскага. Сам акт прыняцця уніяцтва быў для праваслаўнага насельніцтва ломкай традыцыйных поглядаў, а ва ўмовах адноснай свабоды веравызнання з'яўляўся і своеасаблівым замахам на былое жыццё, якое ўключала ўжо сфарміраваны этнічны стэрэатып моўных, культурных, бытавых і канфесіянальных нормаў. Таму унія выклікала ў большасці праваслаўнага насельніцтва незадаволенасць і пратэст, што і выявілася ў антыкаталіцкім і антыпольскім руху.

Імкненне дзяржаўнай улады аслабіць рэлігійнае і этнічнае процістаянне ў Рэчы Паспалітай выявілася ў шэрагу кампрамісаў, якія часцей за ўсё ажыццяўляліся за кошт абмежавання праваслаўя. Пры гэтым прыярытэт аддаваўся каталіцызму. Тым не менш нельга пагадзіцца са сцвярджэннем некаторых гісторыкаў, што беларусы



заўжды былі выключна праваслаўнай этнаканфесіянальнай супольнасцю, а беларускія каталікі і уніяты былі галоўным чынам палякі і літоўцы. Такі погляд, натуральна, не дае правільнага ўяўлення аб этнічным масіве беларускага народа ў Вялікім княстве Літоўскім, які вызначаўся не столькі адзінай канфесіяй, колькі адзінай літаратурнай мовай, агульнасцю тэрыторыі, падабенствам асноўных форм культуры і самасвядомасці з улікам таго, што гэта была этнічная супольнасць феадальнага тыпу. Да таго ж у Вялікім княстве Літоўскім, якое ўтварылася ў XIII ст. шляхам аб'яднання заходнерускіх і літоўскіх земляў, беларуская мова мела статус дзяржаўнай. Вядома, што для беларускага этнасу перыяду фарміравання было характэрна імкненне да поліканфесіянальнасці, што з'яўлялася спецыфічнай рысай яго этнічнай гісторыі. Гэта і было абумоўлена тым, што Беларусь апынулася паміж двух культур -- праваслаўна-візантыйскай і каталіцка-раманскай.

Кансалідацыя дзяржаўнага жыцця беларускага народа ў межах Вялікага княства Літоўскага была звязана непасрэдна з еўрапейскай цывілізацыяй. У Вялікім княстве Літоўскім на працягу ўсяго яго існавання развіваліся класічныя еўрапейскія інстытуты дзяржаўнай улады, акумуляваныя ў Статутах Вялікага княства (1525 г., 1566 г.), склалася своеасаблівая форма саслоўна-прадстаўніцкай манархіі шляхецкая дэмакратыя. Самі ж статуты, напісаныя на беларускай мове, з'яўляліся сведчаннем высокай прававой культуры, адлюстроўвалі такія прагрэсіўныя ідэі, як суверэннасць дзяржавы, усеагульнасць права і інш. Пасля заключэння Крэўскай уніі і ўсё большага збліжэння з Польшчай у арганізацыю кіравання дзяржавай сталі пераносіцца тыя рысы і формы, якія склаліся тады ў еўрапейскіх дзяржавах. Пры вялікім князі ("гаспадары") важным дарадчым органам з'яўлялася рада ("паны-рада"). Рада паноў ("паны-рада") бярэ свой пачатак са старажытных часоў, калі яна існавала пры кожным князі. Паступова значэнне і ўплыў рады ўзрасталі, і яна замест дарадчага органа пры вялікім князі пераўтвараецца ў дзяржаўную ўстанову, якая ўжо юрыдычна абмяжоўвае княжацкую ўладу. На падставе прывілеяў, выдадзеных вялікім князем у 1492 і 1506 гг., яна атрымлівае шырокія дзяржаўныя паўнамоцтвы. Без рады князь не меў права выдаваць законы і пастановы агульнага характару, размяркоўваць самастойна дзяржаўныя даходы, ажыццяўляць знешнепалітычныя акцыі. У раду спачатку ўваходзілі выключна каталікі. Аднак ужо ў пачатку XУI ст. сярод паноў рады з'явіліся і

праваслаўныя. У склад рады ўваходзілі каталіцкі епіскап, ваяводы, каштэляны (камандзіры мясцовага войска), некаторыя старасты і ўрадавыя чыны: маршалкі (старшынствуючыя на пасяджэннях сейма і рады), канцлер (кіраўнік дзяржаўнай канцылярыі), гетман (камандуючы ўзброенымі сіламі), падскарбій (кіраўнік фінансаў) і іншыя. Асаблівае значэнне ў сістэме дзяржаўнага кіравання меў "вальны сейм", у які ўваходзілі члены рады, найважнейшыя чыны цэнтральнага і мясцовага кіравання, прадстаўнікі каталіцкага і праваслаўнага духавенства, а таксама па два дэпутаты ад шляхты з кожнага павета. Сейм з'яўляўся саслоўна-прадстаўнічым органам, які прымаў заканадаўчыя акты, устанаўліваў падаткі для вядзення вайны, вырашаў судовыя справы. У яго функцыі ўваходзіла таксама абранне вялікага князя.

Уключэнне заходніх земляў Русі ў склад Вялікага княства Літоўскага супала з пачаткам фарміравання беларускага этнасу. Працэс гэты быў паступовым, і выспяванне асноўных прызнакаў, уласцівых беларускаму этнасу, заняло некалькі стагоддзяў. Перадумовы фарміравання беларускага этнасу скляліся яшчэ ў перыяд Полацкага княства. Найбольш спрыяльныя ўмовы для яго фарміравання скляліся ў XIУ--ХУI стст. У гэты перыяд моцная вярхоўная ўлада, якая ўсталявалася ў Вялікім княстве Літоўскім, у немалой ступені спрыяла аб'яднаўчым працэсам, наладжванню больш цесных эканамічных і этнічных сувязей паміж рознымі рэгіёнамі краіны. Гэтым былі створаны аб'ектыўныя перадумовы для фарміравання этнічнай тэрыторыі беларусаў. У XIУ--ХУI стст. набывае аднолькавасць бытавая культура. Распаўсюджваюцца аднолькавыя тыпы прылад для апрацоўкі глебы і збора ураджаю. У выніку ажыўлення эканамічнай дзейнасці ў гарадах утварылася моцнае гарадское саслоўе з яго характэрным побытам. Змены ў матэрыяльнай культуры і мове насельніцтва Беларусі ў XIУ--ХУI стст. былі настолькі значнымі, што ў гэты час сфарміраваўся новы комплекс традыцыйнай культуры і новая сістэма мовы, якая адлюстроўвала працэс станаўлення беларускага этнасу. Этнакультурны працэс таго часу быў таксама важнай часткай фарміравання беларускага этнасу.

Як і ўсякая этнічная супольнасць, беларускі этнас характарызаваўся агульнымі прызнакамі: тэрыторыяй этнасу, пануючым эканамічным укладам, адзінай мовай, псіхічным складам, праяўляючым сябе ў культуры, этнічнай самасвядомасці.

Беларускі народ, які з'яўляецца дамінуючым этнасам, стварыў



значныя культурныя каштоўнасці, якія сталі здабыткам агульнаеўрапейскай і міравой культуры. Сваёй самаадданай асветніцкай працай Скарына далучыў яго да духоўнай культуры Еўропы. Свой уклад у развіццё беларускай культуры ўнеслі С. Будны, В. Цяпінскі і інш. У ХУ--ХУI стст. беларуская культура дасягае найбольшага свайго росквіту. У гэты перыяд Беларусь актыўна ўключаецца ў еўрапейскі культурна-гістарычны працэс. У Вялікім княстве Літоўскім ва ўмовах палітычнага і духоўнага ўзаемадзейнічання здбывалася таксама станаўленне літоўскай, украінскай і польскай культур. Усе народы, якія прымалі ўдзел у палітычным, эканамічным і культурным жыцці Вялікага княства Літоўскага, перш за ўсё беларускі і літоўскі, з'яўляюцца гістарычнымі нашчадкамі гэтай дзяржавы. Таму ёсць усе падставы Вялікае княства Літоўскае, Жамойцкае і Рускае лічыць Беларуска-Літоўскай дзяржавай.

## 3. АСАБЛІВАСЦІ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯЎ У МЕЖАХ РАСІЙСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

У выніку падзелаў Рэчы Паспалітай да Расіі былі далучаны беларускія землі, на якіх пражывала больш за 3 млн. чалавек. Па адміністрацыйнай рэформе тэрыторыя Беларусі была падзелена на пяць губерняў: Віцебскую (губернскі горад Віцебск), Мінскую (губернскі горад Мінск), Гродзенскую (губернскі горад Гродна), Віленскую (губернскі горад Вільна). Прычым у Віцебскую губерню таксама ўвайшлі паветы з рускім і латышскім насельніцтвам, у Гродзенскую і Віленскую -- з польскім і латышскім. Віцебская і Магілёўская губерні утварылі беларускае генерал-губернатарства, Гродзенская, Мінская і Віленская -- Літоўскае генерал-губернатарства.

На беларускіх землях, якія адышлі па падзелу Рэчы Паспалітай да Расіі, шляхце, што прысягнула царскай уладзе, даваліся ўсе правы і прывілеі, якімі карысталася дваранства па законах Расійскай імперыі. Аднак былі абмежаваны правы і самастойнасць магнатаў. Рускі ўрад забараніў мець ім уласнае войска, зменшыў самаўпраўства шляхты. У 1774 г. па дароўнай грамаце Кацярыны II была ўтворана Беларуская каталіцкая епархія. Устанаўлівалася свабоднае спавяданне каталіцкай веры, захоўваліся зямельныя ўладанні каталіцкіх касцёлаў і кляштараў. Аднак каталіцкаму і уніяцкаму духавенству забаранялася схіляць да сваёй

веры праваслаўных. Каталіцкая царква страціла сваё пануючае палажэнне ў Беларусі.

На беларускія гарады распаўсюджваліся прынцыпы рускага самакіравання, якія былі вызначаны "Жалаванай граматай гарадам" 1785 г. Яна ліквідавала юрысдыкцыю свецкіх і царкоўных феадалаў над гараджанамі, якія пражывалі на гэтых землях. Урад таксама вымушаны быў выкупіць прыватнаўладальніцкія гарады і мястэчкі. У сярэдзіне XIX ст. у Беларусі налічвалася больш за 290 гарадоў, у якіх пражывала 316 тысяч чалавек.

Па рускаму ўзору было арганізавана і кіраванне губернямі Беларусі (выканаўчая ўлада перадавалася губернатарам, у губернскія праўленні, казённыя палаты і іншыя адміністрацыйныя ўстановы). Да 1840 г. у беларускіх губернях асноўным заканадаўчым кодэксам заставаўся Статут Вялікага княства Літоўскага 1588 г. Былі ўнесены толькі змены ў сістэму судовых устаноў. На тэрыторыі Беларусі былі створаны губернскія земскія суды для разгляду часткі грамадзянскіх спраў. У гэты перыяд пачалі дзейнічаць спецыяльныя царскія ўказы, што датычыліся сацыяльна-бытавога стану яўрэйскага насельніцтва, якое жыло на тэрыторыі Беларусі. Яўрэям, што займаліся гандлем, па ўказу 1780 г. дазвалялася запісваща ў купецтва. Царскім загадам 1794 г. вызначалася мяжа яўрэйскай аседласці, у якую ўвайшлі беларускія і частка украінскіх земляў. У 50-я гады на тэрыторыі Беларусі цалкам зацвердзілася заканадаўства Расійскай імперыі.

З далучэннем беларускіх земляў да Расіі амаль не адбылося змен у сацыяльна-эканамічным становішчы сялян. Яны як і раней заставаліся залежнымі ад сваіх уладальнікаў. Рускі царызм шырока раздаваў маёнткі з сялянамі рускім памешчыкам, буйным ваенным чыноўнікам, дзяржаўным саноўнікам. Фондам для гэтага служылі староствы і каралеўскія эканоміі, секвестраваныя маёнткі магнатаў і шляхты, выехаўшых за мяжу, і валоданні некаторых ліквідаваных каталіцкіх кляштараў. Асноўная частка такіх земляў была раздадзена ва Усходняй Беларусі. У пачатку XIX ст. рускія памешчыкі атрымалі ў беларускіх губернях больш 200 тысяч рэвізскіх (мужчынскіх) душ. Асобныя катэгорыі сялян, якія раней лічыліся вольнымі і паўвольнымі (галоўным чынам асобы, якія знаходзіліся на службе польскіх і літоўскіх феадалаў), сталі таксама прыгоннымі.

У сярэдзіне XIX стст. сялянства складала амаль 90 працэнтаў



усяго насельніцтва Беларусі. Каля 70 працэнтаў сялян з'яўляліся прыгоннымі, і толькі каля 19 працэнтаў былі казённымі (дзяржаўнымі) сялянамі. Невялікую групу (каля 3 працэнтаў) складалі дваровыя сяляне, якія не вялі сваёй гаспадаркі, а працавалі на памешчыцкім двары і знаходзіліся на натуральным утрыманні. Памешчыцкае землеўладанне ў Беларусі захавала буйнапамесны характар. Амаль чвэрць усіх зямельных плошчаў беларускіх губерняў (на пачатак XX ст. памешчыкі валодалі 10 млн. дзесяцін зямлі) належыла 100 буйным аграрным магнатам. Большасць жа памешчыкаў мелі ад 100 да 500 дзесяцін зямлі.

Ва ўмовах абвастрэння крызісу феадальна-прыгонніцкіх адносін рускі царызм імкнуўся ўзмацніць свае палітычныя пазіцыі ў Беларусі. Задушыўшы польскае паўстанне 1830--1831 гг., царскія ўлады нанеслі ўдар і па тайных рэвалюцыйных арганізацыях ў Беларусі. Важнае значэнне ў барацьбе з рэвалюцыйным рухам адводзілася "Асобаму камітэту па справах заходніх губерняў", які быў створаны ў 1832 г. Адной з галоўных задач у працы камітэта было насаджэнне рускага дваранскага землеўладання ў Беларусі і Літве. Хоць гэтыя меры і мелі пэўны поспех, аднак спыніць рэвалюцыйнае бражэнне, якое сыходзіла ад мясцовай шляхты, не ўдалося. Тады камітэт паспрабаваў арганізаваць масавае перасяленне ў Беларусь рускіх дзяржаўных сялян. Аднак і гэтыя меры не далі станоўчых вынікаў. "Асобы камітэт па справах заходніх губерняў" пачаў ажыццяўленне мерапрыемстваў па русіфікацыі Беларусі (гэтая палітыка праводзілася ў галіне кіравання, суда, асветы, культуры). У мясцовыя адміністрацыйныя органы прызначаліся рускія чыноўнікі.

У 1839 г. па загаду царскіх улад аб'ядноўвалася ўніяцкая царква з праваслаўем, што аслабіла польска-каталіцкі ўплыў на беларускае насельніцтва. У гэты ж перыяд як каталіцкае, так і праваслаўнае духавенства пазбавілася правоў валодання зямлёй і сялянамі. У 1840 г. на тэрыторыі беларускіх губерняў адмянілі дзейнічанне Літоўскага Статута, паўсюдна ўводзілася рускае заканадаўства. Усё дзяржаўнае справаводства, а таксама выкладанне ў навучальных установах вялося толькі на рускай мове. Асобым царскім загадам, выдадзеным у 1840 г., забаранялася ўжываць у афіцыйных дакументах тэрміны "беларускія губерні", "Беларусь" і замест іх уводзілася назва "Паўночна-заходні край".

Такая палітыка, натуральна, не магла ўмацаваць царызм у Беларусі, стрымаць далейшае развіццё рэвалюцыйнага руху. Гэтаму не

спрыялі і сацыяльна-эканамічныя працэсы, што адбываліся ў беларускіх губернях. У канцы XVIII ст. у Беларусі, як і па ўсёй Расіі, пачаўся разлажэнне феадальна-прыгонніцкага ладу. У яго нетрах фарміраваліся новыя буржуазныя адносіны. Памешчыцкая гаспадарка губляла свой натуральны характар і ўсё больш звязвалася з рынкам. У сувязі з гэтым узмацняецца працэс маёмаснага расслаення сялян.

Прамысловасць у Беларусі развівалася своеасабліва. На працягу першай паловы XIX ст. тут пераважала дробная вытворчасць. У 1860 г. з агульнай колькасці 4020 прамысловых прадпрыемстваў 3860 уяўлялі сабой невялікія майстэрні: на кожнай з іх працавала менш за 16 рабочых. Як вядома, большасцю прадпрыемстваў валодалі памешчыкі. На іх працавалі прыгонныя сяляне. Перавага прыгоннай працы на прамысловых прадпрыемствах Беларусі была асаблівасцю яе эканамічнага развіцця. У моц гэтага ў беларускіх губернях вельмі марудна развівалася капіталістычная вытворчасць. Прыгоннае права стрымлівала пераход Беларусі да індустрыяльнага этапа развіцця.

У 40--50-я гады працэс разлажэння феадальна-прыгонніцкай сістэмы перарос у крызіс. Аб гэтым сведчыць разарэнне сялянскай гаспадаркі, заняпад памешчыцкіх маёнткаў, марудныя тэмпы прамысловага развіцця. У абстаноўцы нарастання рэвалюцыйнага крызісу царскія ўлады вымушаны былі пачаць падрыхтоўку адмены прыгоннага права. Правядзенне рэформы рускае самадзяржаўе вырашыла пачаць з беларуска-літоўскіх губерняў. 19 лютага 1861 г. Маніфест аб адмене прыгоннага права і праект "Палажэнняў аб сялянах, якія выйшлі з прыгоннай залежнасці", былі зацверджаны царом. У Беларусі рэформа 1861 г. праводзілася на аснове агульнага і двух мясцовых "Палажэнняў". Згодна з гэтымі дакументамі, беларускія сяляне абвяшчаліся асабіста вольнымі. У карыстанне ім былі выдзелены невялікія надзелы. Там, дзе панавала абшчыннае землекарыстанне (у Магілёўскай і Усходняй частцы Віцебскай губерняў), памер сялянскага надзелу вызначаўся ў залежнасці ад плошчы пахатнай зямлі, якая заставалася ў памешчыкаў. Найвялікшы надзел на душу мужчынскага полу вызначаўся ў памеры 4--5,5 дзесяціны зямлі, самы малы -- 1,3--2,8 дзесяціны. У Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях "Палажэнне" захоўвала дарэформенны надзел, што ўзаконьвала адрэзкі, якія выдзяляліся памешчыкамі да рэформы.

І хоць рэформа 1861 г. была праведзена не на карысць сялян,



яна адкрывала шлях да зацвярджэння буржуазнага грамадства ў Беларусі.

Апынуўшыся ў канцы XVIII ст. у межах Расійскай імперыі, беларускі народ паступова асэнсоўваў свой шлях гістарычнага развіцця. Калі ў першай палове XIX ст. рост рэвалюцыйнай самасвядомасці беларусаў выяўляўся ў межах польскага рэвалюцыйнага руху, то паўстанне 1863 г. пакінула глыбокі след у свядомасці ўсіх слаёў беларускага грамадства, істотна паўплывала на спецыфіку грамадска-палітычнай думкі. Адзін з яго кіраўнікоў К. Каліноўскі на старонках заснаванай ім першай беларускай газеты "Мужыцкая праўда" заклікаў народ адстойваць ідэі сацыяльнай і нацыянальнай свабоды. У ходзе паўстання ён заклікаў стварыць незалежную ад Польшчы і Расіі Беларускую рэспубліку. Сфармуляваная ім нацыянальна-дзяржаўная ідэя атрымала развіццё ў праграмах усіх грамадскіх рухаў, а потым і з'явіўшыхся ў XX ст. на палітычнай арэне беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый (БСГ і інш.). Яны выступалі за ўстанаўленне ў Расіі федэратыўнай рэспублікі з агульным сеймам (Канстытуцыйным сходам) для ўсіх народаў і прадастаўленне нацыянальна-дзяржаўнай самастойнасці Беларусі ў межах гэтай федэрацыі.

У межах Расійскай дзяржавы пачаўся працэс фарміравання беларускай нацыі. Ён быў звязаны з развіццём капіталізму, які і даў пачатак новаму этапу ў развіцці беларускага этнасу. Беларуская нацыя фарміравалася на этнічнай і сацыяльнай аснове, характэрнай для папярэдняй феадальнай эпохі. Некаторыя рысы, уласцівыя беларускай нацыі -- мова, тэрыторыя, самасвядомасць, асаблівасці псіхічнага складу -- вызначыліся ў папярэдні перыяд і складалі аснову для ее фарміравання. Новым і абавязковым прызнакам любой нацыі з'яўляецца тэндэнцыя да развіцця эканамічных сувязей, наяўнасць уласнай прамысловасці, рабочага класа, буржуазіі. Гэтыя прызнакі нацыі маглі з'явіцца толькі з развіццём капіталізму. Працэс фарміравання беларускай нацыі быў доўгім, адносна марудным і супярэчлівым. Ён заняў перыяд з канца XVIII стагоддзя і працягваўся ў XX стагоддзі. Беларуская нацыя фарміравалася ў межах Расійскай дзяржавы на тэрыторыі пяці паўночна-заходніх губерняў: Мінскай, Магілёўскай, Віцебскай, Віленскай і Гродзенскай. Гэта, натуральна, не магло не адбіцца на рысах і спецыфіцы этнічнага развіцця беларусаў: на мове, адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленні, эканоміцы, культуры,

нацыянальнай самасвядомасці. Да таго ж нацыянальны склад насельніцтва Беларусі быў неаднародным. Па перапісу 1897 г. на яе тэрыторыі пражывала больш за 6,5 млн. чалавек. 73 працэнты іх складалі беларусы, 13,8 працэнта -- яўрэі, 4,7 працэнта -- украінцы, 4,3 працэнта -- рускія, 2,5 працэнта -- палякі і 1,7 працэнта -- іншыя народнасці. Беларусы ў асноўнай сваёй масе з'яўляліся сялянамі.

На пачатак XIX ст. сацыяльная структура беларускага насельніцтва характарызавалася наступным чынам: больш 50 працэнтаў (каля 2530 тысяч чалавек) з'яўляліся батракамі і вясковай беднатой, 30 працэнтаў (больш 1514 тысяч) -- сярэднім сялянствам, каля 20 працэнтаў (1030 тысяч) -- памешчыкамі, аграрнай буржуазіяй, фальваркавай шляхтай, купецтвам. Гандлёва-прамысловае насельніцтва падзялялася на ўладальнікаў прамысловых прадпрыемстваў, гандляроў (каля 20 тысяч), рабочых і раменнікаў (разам з сем'ямі 200 тысяч). Каля 80 працэнтаў беларускага насельніцтва складаў пралетарыят, паўпралетарыят і бяднейшая частка беларускай вёскі, а амаль 20 працэнтаў адносілася да заможных слаёў. Значную праслойку сярод маёмных слаёў насельніцтва займала аграрная буржуазія (з 650 тысяч сялянскіх двароў 71 тысяча былі заможнымі, гэта значыць каля 11 працэнтаў усіх гаспадарак). Па эканамічнаму становішчу да вясковай буржуазіі блізка далучалася фальваркавая і засценкавая шляхта.

Частка шляхты была апалячанай, але, як сведчаць даследаванні па этнаграфіі і гісторыі Беларусі, па нацыянальнаму паходжанню большасць яе была беларускай. Шляхта з'яўлялася найбольш актыўнай палітычнай сілай беларускага насельніцтва. Гэта было абумоўлена яе асобым становішчам у эканамічным жыцці края. Я. Лёсік, адзін з ідэолагаў беларускага нацыянальнага адраджэння, пісаў пра гэта так: "Шляхта не ведала прыгоннага права і мела 2 валокі зямлі, ці 40 дзесяцін. Праўда, была і беззямельная шляхта... Да апошняга часу большасць мела добрыя гаспадаркі. Дзякуючы большай заможнасці ў параўнанні з сялянскімі гаспадаркамі шляхта дасягнула высокага культурнага узроўню. Шляхта заўжды была ў курсе рыначных цэн і ўмела гэтым карыстацца пры сбыце сваёй прадукцыі. Пры іншых гістарычных умовах шляхта заснавала б буржуазную прамысловасць і гандлёвую буржуазію".

Аднак гэтага не адбылося, былі магутныя стрымліваючыя фактары, якія не дазволілі шпаркімі тэмпамі сфарміравацца беларус-



кай нацыянальнай буржуазіі. Адным з такіх стрымліваючых фактараў з'яўлялася мяжа яўрэйскай аседласці, куды ўваходзілі і беларускія губерні. На гэтай тэрыторыі царскія ўлады забаранілі яўрэйскаму насельніцтву займацца сельскай гаспадаркай, і таму ўсе яны былі сканцэнтраваны ў гарадах. Празмернасць яўрэйскай рабочай сілы і наогул перанаселенасць гарадоў яўрэйскім насельніцтвам, якое займалася галоўным чынам рамесніцтвам і гандлем, стрымлівала прыток у іх выхадцаў з беларускай вёскі, што, натуральна, дэфарміравала працэс станаўлення беларускай нацыянальнай буржуазіі. Канкурэнцыя з рускай і яўрэйскай буржуазіяй, вузкасць унутранага рынку, засілле польскіх памешчыкаў -- усё гэта не дазваляла ёй як класу заявіць пра сябе ў поўны голас. На пачатковым этапе развіцця капіталізму яна не магла аказаць моцны ўплыў на палітычнае і духоўнае жыццё беларускага грамадства. А гэта, безумоўна, не магло не адбіцца на развіцці нацыянальнай самасвядомасці беларусаў, якая па шматлікіх прычынах засталася несфарміраванай.

На працягу некалькіх стагоддзяў беларускі народ апынуўся на мяжы процістаяння двюх славянскіх дзяржаў -- польскай і рускай. У сваёй палітыцы абедзве гэтыя дзяржавы ігнаравалі інтарэсы беларускага народа. Характэрнай рысай палітыкі Расіі і Польшчы адносна да беларускіх земляў з'яўлялася не толькі тэрытарыяльная экспансія, але і пастаяннае імкненне змяніць этнічную арыентацыю беларускага народа (апалячыць ці русіфікаваць). Гэта рабілася дзеля таго, каб зацвердзіць тут законнасць прэтэнзій двюх спаборнічаючых паміж сабою дзяржаў. У моц гэтага беларусаў вымушалі капіраваць самасвядомасць суседніх этнасаў -- рускага ці польскага. Менавіта гэта і наклала адбітак на фарміраванне беларускай нацыі. Кансалідацыю беларусаў у нацыю стрымлівалі і тыя абставіны, што яны да гэтага часу не мелі сваёй дзяржаўнасці, і гэты працэс развіваўся ў межах шматнацыянальнай Расійскай імперыі.

Тым не менш з развіццём капіталізму ішоў паступовы працэс фарміравання беларускай нацыі. Стварэнне эканамічнай і тэрытарыяльнай супольнасці абумовіла ўзнікненне адзінай беларускай мовы. Нацыянальная беларуская мова фарміравалася пераважна на грунце сярэднебеларускай (мінска-маладзечанскай) дыялектнай групы. Жывая народная гаворкавая мова паступова замацоўвалася ў літаратуры. Аднак у сувязі з тым, што яна з'яўлялася мовай прыгнечанай нацыі, не маючай сваёй дзяржаўнасці, яе станаўленне затрымліва-

лася. На ёй не вялося навучанне ў школах, амаль што не выдаваліся публіцыстычныя і мастацкія творы.

У пачатку XX ст. у сувязі з актывізацыяй дэмакратычных сіл пачаўся ўздым беларускага нацыянальнага вызваленчага руху. Гэтаму спрыяла рэвалюцыя 1905--1907 гг. Мэтай беларускага нацыянальнага руху было развіццё нацыянальнай культуры, мовы, стварэнне дзяржаўнасці беларускага народа. Арганізатарам, ідэйным і палітычным кіраўніком барацьбы за нацыянальнае адраджэнне з'яўлялася Беларуская сацыялістычная грамада (БСГ) -- партыя, якая была створана ў пачатку XX ст. Яна аб'ядноўвала прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў, накіраваных на дэмакратычнае пераўтварэнне грамадства. БСГ намагалася стаць выразнікам імкненняў усяго беларускага народа, актыўна выступала за фарміраванне яго нацыянальнай самасвядомасці.

У гэты перыяд у Беларусі праходзілі сацыяльна-эканамічныя змены, якія былі звязаны са станаўленнем і далейшым распаўсюджваннем новых элементаў індустрыяльнага грамадства. Аднак гэты працэс у Беларусі працякаў замаруджанымі тэмпамі. Галоўнай прычынай усяго гэтага было тое, што Беларусь, з'яўляючыся аграрнай ускраінай Расійскай імперыі, якая па сутнасці была і сама краінай другога эшалона індустрыяльнага развіцця, даганяючага тыпу, апынулася ў ліку тых нацыянальных рэгіёнаў, якія заставаліся яе сыравінным прыдаткам. Таму ў сістэме Расійскай імперыі беларускія губерні характарызаваліся адносна невысокім узроўнем эканамічнага развіцця, што, натуральна, адбівалася на сацыяльна-класавай і палітычнай кансалідацыі беларускай нацыі.

Рэвалюцыя ў Расіі адкрыла новы этап у барацьбе беларускага народа за сваё сацыяльнае і нацыяльнае вызваленне.

## 4. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ. БАРАЦЬБА ЗА РЭАЛІЗАЦЫЮ ДЗЯРЖАЎНАГА СУВЕРЭНІТЭТА.

Рэвалюцыя 1917 г. паскорыла працэс фарміравання рэвалюцыйнай самасвядомасці працоўнага народа Беларусі. Яна абудзіла беларускі народ да асэнсавання неабходнасці аднаўлення сваёй незалежнай дзяржаўнасці. Носьбітам ідэі самавызначэння беларускага народа выступалі нацыянальна-дэмакратычныя партыі (БСГ, БНГ, БХД, БПНС і інш.), дзейнасць якіх каардынавала Вялікая беларуская рада. Яны ў сваіх патрабаваннях абмяжоўваліся нацыянальна-дзяржаўным утварэннем у межах адзінай Расійскай дэмакратычнай дзяржавы. Ідэі і рух да нацыянальнай дзяржаўнай незалежнасці супалі з ломкай сацыяльна-эканамічнай і палітычнай сістэмы ў ходзе Кастрычніцкай рэвалюцыі.



Важнай вехай на шляху да беларускай дзяржаўнасці быў Усебеларускі з'езд, які праходзіў у Мінску 15--18 снежня 1917 г. З'езд быў скліканы па ініцыятыве Вялікай беларускай рады, а таксама Беларускага абласнога камітэта (БАК) пры Выканкаме Усерасійскага Савета сялянскіх дэпутатаў, які стаяў на пазіцыях эсэраў.

На з'ездзе былі прадстаўлены розныя палітычныя плыні -- ад членаў буржуазных нацыянальных груповак да прадстаўнікоў рэвалюцыйна-дэмакратычных партый і арганізацый. Усяго на з'ездзе прысутнічала 1872 дэлегаты (1167 дэлегатаў мелі рашаючы голас, 705 -- дарадчы). Такога форума ў 1917 г. не збіраў ні водны народ Расіі. Называць гэты з'езд Усебеларускім меліся ўсе падставы: на ім былі прадстаўлены Віленская, Віцебская, Магілёўская, Мінская, Гродзенская і Смаленская губерні. Большасць партыйных дэлегацый належалі да сацыялістычных рухаў (БСГ, БНГ, БС-ДРП, эсэры, працоўнікі). Па сацыяльнаму складу на з'ездзе былі прадстаўлены галоўным чынам сяляне. Гэта адлюстроўвала сутнасць сацыяльна-класавай структуры самога беларускага народа. Таму невыпадкова з'езд узначаліў як ганаровы старшыня сялянскі сын з Гродзенскай губерні акадэмік Я.Карскі. Па ўсіх карэнных пытаннях рэвалюцыі, асабліва па праблемах улады, вайны і міру, аграрнаму, дэлегаты не разыходзіліся з намерамі бальшавікоў. Па нацыянальнаму пытанню выявіліся дзве лініі. Адна з іх -- лінія на абвяшчэнне незалежнай парламенцкай рэспублікі, другая -- на прадастаўленне Беларусі статуса нацыянальна-дзяржаўнай аўтаноміі ў межах Расійскай дэмакратычнай рэспублікі. Бальшавіцкая фракцыя, якая аб'яднала на з'ездзе 118 дэлегатаў, кіруючыся ўстаноўкамі Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП(б), адмоўна сустрэла гэтыя прапановы. Яна выступіла супраць стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці беларускага народа. Гэта і падштурхнула частку дэлегатаў з'езда да больш рашучых дзеянняў -- яны сталі патрабаваць абвяшчэння незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Аднак сярод дэлегатаў быў моцны аўтанамісцкі настрой. Таму іх патрабаванні засталіся не рэалізаванымі.

У ноч з 17 на 18 снежня 1917 г. прыступілі да абмеркавання і прыняцця рэзалюцыі. З'езд вырашыў: устанавіць рэспубліканскі

лад у межах беларускай зямлі. Пры гэтым прызнаў, што Беларусь з'яўляецца складанай часткай Расіі. З'езд таксама выказаўся за неадкладнае стварэнне органа краявой улады ў асобе Усебеларускага савета сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, якому часова да скліканння Усебеларускага Устаноўчага сходу перадавалася кіраванне краем і даручалася устанавіць адносіны з цэнтральнай уладай, адказнай перад Саветам рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Ідэя самавызначэння Беларусі, якая ішла знізу, ад ініцыятывы народных мас, атрымаўшы адлюстраванне ў настроі сацыялістычных фракцый з'езда, была падхоплена і падтрымана ўсімі яго дэлегатамі як альтэрнатыва палітыцы Паўночна-Заходняга абкама РСДРП(б) у нацыянальным пытанні. На з'ездзе, такім чынам, перамагла аўтанамісцкая плынь.

Аднак такое рашэнне не адпавядала ўстаноўкам Паўночна-Заходняга абкама РСДРП(б). Пасля таго, як быў прыняты першы пункт рэзалюцыі, па яго рашэнню з'езд быў разагнаны. Гэтым самым палітычныя метады барацьбы былі вычарпаны і праціборствуючыя сілы перайшлі да адкрытай канфрантацыі. Нягледзячы на рэпрэсіі, якія абрушыліся на дэлегатаў з'езда з боку бальшавікоў, яны не дэмаралізаваліся. Пад аховай мінскіх чыгуначнікаў дэлегаты, якія з'яўляліся законнымі прадстаўнікамі беларускага народа, сабраліся ў чыгуначным дэпо і выбралі Раду (савет) Усебеларускага з'езда. 21 снежня 1917 г. Рада-Выканаўчы камітэт на чале з Я. Варанко пасля таго, як часці Чырвонай Арміі пакінулі Мінск, а германскія яшчэ не занялі яго (пасля зрыву мірных перамоў нямецкія войскі пачалі займаць тэрыторыю Беларусі), выйшаў з падполля і 21 лютага абвясціў "Першую Устаўную Грамату да народаў Беларусі". У ёй ён абвясціў сябе часовай уладай на тэрыторыі Беларусі і ўзяў на сябе абавязацельства склікаць Усебеларускі Устаноўчы з'езд. Выканкам таксама сфарміраваў першы беларускі урад -- Народны сакратарыят. Яго першым старшынёй стаў Я. Варанко.

Выканкам з'езда паслядоўна дзейнічаў у адпаведнасці з палітычнай сітуацыяй, якая складвалася ў Беларусі. Як толькі быў падпісаны Брэсцкі мірны дагавор і значная частка тэрыторыі Беларусі апынулася пад германскай акупацыяй, Выканкам прыняў "Другую Устаўную Грамату", у якой абвясціў Беларусь (у этнаграфічных межах пражывання беларусаў) Народнай Рэспублікай -- БНР. Яе асноўныя этапы павінен быў зацвердзіць устаноўчы з'езд, які меркавалася склікаць на аснове ўсеагульнага, роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права, незалежна ад роду заняткаў, нацыянальнай прыналежнасці і веравызнання. Рэарганізаваны ў Раду БНР выканкам з'езда быў аб'яўлены заканадаўчым органам, а выканаўчым -- Народны сакратарыят. Грамата дэкларавала асноўныя дэмакратычныя прынцыпы: свабоду слова, друку, сходаў, забастовак, а таксама правы на нацыянальна-асабістую аўтаномію, раўнапраўе ўсіх моў народаў Беларусі, заявіла аб адмене прыватнай уласнасці на зямлю і перадачы зямлі тым, хто яе апрацоўвае, і інш.



Вясной 1918 г. грамадска-палітычная сітуацыя ў Беларусі склалася не на карысць бальшавікоў. На акупаванай тэрыторыі, у прыватнасці ў Мінску, на першае месца выступіла Беларуская сацыялістычная грамада, якая фактычна ўзяла на сябе ініцыятыву стварэння нацыянальнай дзяржаўнасці. Па ініцыятыве яе фракцыі 24 і 25 сакавіка 1918 г. Рада БНР прыняла "Трэцюю Устаўную Грамату", у якой абвяшчала незалежнасць Беларускай Народнай Рэспублікі ў этнаграфічных межах пражывання беларусаў (Магілёўшчына, беларускія часткі Міншчыны, Гродзеншчына -- з Гродна, Беластокам і інш., Віленшчына, Смаленшчына, Чарнігаўшчына). Гэты факт быў прызнаны дэ-юрэ Украінскай Народнай Рэспублікай, Літвой і дэ-факта Турцыяй, Фінляндыяй і самой Савецкай Расіяй. Германія не прызнала незалежную БНР. Адмовіліся прызнаць яе незалежнасць і урады краін Антанты. Ва ўмовах нямецкай акупацыі, незалежна ад яе зместу і формы, БНР аб'ектыўна не магла стаць рэальнасцю. Рада БНР і Народны сакратарыят стварылі пэўную палітычную структуру з зачаткамі дзяржаўнай арганізацыі. Разглядаючы сябе выразнікамі і абаронцамі інтарэсаў беларускай нацыі, яны заявілі пра шмат якія крокі ў рэалізацыі яе правоў на самастойную дзяржаўнасць. Аднак у моц неспрыяльных для БНР знешнепалітычных і ўнутраных абставін поўнае ўвасабленне ў жыццё нацыянальна-дзяржаўнай ідэі так і засталося неажыццёўленай надзеяй. Тым не менш гэта была важная старонка ў гісторыі беларускага народа, у вызначэнні яго нацыянальнай дзяржаўнасці.

Абвяшчэнне незалежнай БНР стымулявала рост нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, зрабіла ўплыў на палітычных праціўнікаў самавызначэння Беларусі. Ануляванне Брэсцкага міру, вызваленне тэрыторыі Беларусі ад нямецкай акупацыі, больш узважаная палітыка кіраўніцтва Савецкай Расіі стварылі ўмовы для рэалізацыі ідэі беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Правядзенне падрыхтоўчай работы па стварэнню беларускай савецкай

дзяржаўнасці ў канцы снежня 1918 г., фарміраванне Часовага рабоча-сялянскага ўрада (старшыня З.Ф.Жылуновіч), прыняцце 1 студзеня 1919 г. Маніфеста аб стварэнні БССР сведчыла пра наступленне новай стадыі супярэчлівага і складанага працэсу самавызначэння беларускага народа. Аднак першыя крокі БССР па адраджэнню сваёй незалежнасці былі перапынены працідзеяннем іншых краін.

У моц складаных ваенна-палітычных абставін I з'езд Саветаў Беларусі, які праходзіў 2--3 сакавіка 1919 г., не толькі замацаваў утварэнне БССР і зацвердзіў першую яе Канстытуцыю, але і прыняў рашэнне аб аб'яднанні з Савецкай Літвой. Гэтым самым было перапынена нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі. Гэта штучнае дзяржаўнае ўтварэнне фактычна праіснавала да жніўня 1919 г., г. зн. да той пары, пакуль яго тэрыторыя не была акупавана польскімі інтэрвентамі, і толькі ў канцы ліпеня 1920 г. у выніку вызвалення Беларусі ад польскай акупацыі склаліся ўмовы для аднаўлення савецкай рэспублікі. Гэта ажыццявілася 31 ліпеня 1920 г. абвяшчэннем дэкларацыі аб незалежнасці БССР. Аднак адраджэнне БССР адбылося на тэрыторыі шасці паветаў Мінскай губерні (яшчэ ў 1919 г. Віцебская і Магілёўская губерні ўвайшлі ў склад РСФСР, а ў 1921 г. па Рыжскаму мірнаму дагавору Заходняя Беларусь была ўключана ў склад Польшчы). Працэс станаўлення беларускай дзяржаўнасці быў надзвычай складаным, супярэчлівым, выключна цяжкім і часам драматычным.

У снежні 1922 г. БССР, з'яўляючыся адным з заснавальнікаў СССР, стала яго раўнапраўным членам. Аднак, нягледзячы на ўсялякія перашкоды, у БССР у першыя гады яе існавання працягвалі развівацца нацыянальна-адраджэнчыя працэсы. У кастрычніку 1925 г. беларускаму савецкаму ураду перадала свае паўнамоцтвы Рада БНР, якая знаходзілася ў эміграцыі. Яна прызнала БССР як нацыянальную дзяржаву беларускага народа.

У 20-я гады, калі пачалося ажыццяўленне палітыкі беларусізацыі, адбылося вяртанне беларускага народа да сваіх каранёў. Гэта палітыка ажыццяўлялася не стыхійна, а праз накіраваную дзейнасць органаў дзяржаўнай улады. У 1924 г. і 1926 гг. адбылося ўзбуйненне БССР. У яе склад былі ўключаны паветы з беларускім насельніцтвам, якія раней адыходзілі да РСФСР. У 1939 г. адбылося ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Гэта ўз'яднанне палажыла канец гістарычнай несправядлівасці -- падзелу Беларусі, стварыла ўмовы для кансалідацыі беларускай нацыі.



Умацаванне каманднa-бюракратычнай сістэмы, культу асобы, адмаўленне ад новай эканамічнай палітыкі рэзка абмежавалі і падарвалі тыя асноўныя вынікі, якія былі дасягнуты беларускім народам у нацыянальна-дзяржаўным і культурным будаўніцтве. У 30-я і наступныя гады БССР фактычна фармальна з'яўлялася суверэннай дзяржавай.

Гераізм і самаадданасць беларускага народа ў барацьбе з фашызмам у другой міравой вайне сталі здабыткам міравой супольнасці. Аднак, адміністрацыйна-бюракратычная сістэма, што зацвердзілася ў СССР, растаптала правы беларускага народа і давяла эканоміку і культуру да крызіснага становішча. Незваротны ход гістарычных падзей падвёў беларускі народ да адзіна правільнага выбару: 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР", а 25 жніўня 1991 г. -- аб'явіў аб поўнай незалежнасці Беларусі.

З гэтага часу Рэспубліка Беларусь (так яна завецца) -- суверэнная дзяржава, якая зацвердзілася на аснове ажыццяўлення беларускай нацыяй яе неад'емных правоў на самавызначэнне, дзяржаўнасць беларускай мовы, верхавенства народа ў выбары свайго лёсу ў адпаведнасці з агульнапрызнанымі нормамі міжнароднага права.

Гістарычна знаходзячыся на перакрыжаваннях міравых цывілізацый, Беларусь ужо цяпер з нагоды свайго геапалітычнага становішча можа адыграць вядучую ролю ў станаўленні новай міравой цывілізацыі.

Пытанні для абмеркавання з навучэнцамі:

1. Калі і якія ўсходнеславянскія плямёны засялілі тэрыторыю Беларусі?

2. Чым было выклікана ўзвышэнне Полацкага княства і які эканамічны і грамадска-палітычны лад быў характэрны для яго ў X-XII стст.?

3. Якія прычыны паскорылі ўтварэнне Вялікага княства Літоўскага?

4. Які ўплыў аказалі на ўнутранае жыццё Вялікага княства Літоўскага палітычныя і культурныя традыцыі Полацкага княства?

5. У чым быў асноўны сэнс заключэння Крэўскай, а потым Люблінскай уніі?

6. Значэнне дзейнасці і творчасці Ф.Скарыны і іншых бела-

рускіх асветнікаў.

7. Чаму Вялікае княства Літоўскае згубіла сваю дзяржаўную самастойнасць пасля заключэння Люблінскай уніі?

8. Якія прычыны эканамічнага і культурнага занепада Беларусі ў ХУП--ХУШ стст.?

9. Якой была сутнасць палітыкі царызма ў Беларусі ў канцы ХУШ -- першай палове XIX стст.?

10. Якімі былі асаблівасці сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі ў другой палове XIX -- пачатку XX стст.?

11. Хто і калі абгрунтаваў ідэю нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння беларускага народа?

12. Якое гістарычнае значэнне мае Усебеларускі кангрэс у рэалізацыі нацыянальна-дзяржаўнай ідэі беларускага народа?

13. Ці можна прызнаць дату 25 сакавіка 1918 г. нацыянальным святам беларускага народа?

14. Ці з'яўлялася абвяшчэнне БССР альтэрнатывай Беларускай Народнай Рэспубліцы?

15. У чым была сутнасць палітыкі беларусізацыі 20-х гадоў?

16. Чым было абумоўлена ўмацаванне ў БССР адміністрацыйна-бюракратычнай сістэмы?

17. Якія асноўныя прынцыпы пакладзены ў "Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР", прынятую Вярхоўным Саветам БССР 27 ліпеня 1990 г.?

## Л і т а р а т у р а:


Акты, издаваемые Виленской комиссией для разбора древних актов. Т. 1 -- 39. Вильно, тип. Губ. правл., 1865--1915.

Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 1--5. СПб., тип. 2-го отд-ния собств. е.и.в. канцелярии, 1853--1864.

Акты, относящиеся к истории Южной и Западной России, собранные и изданные Археографической комиссией. Т. 1--15. Спб., 1863--1892.

Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. В 4-х книгах. Минск, 1959--1972.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии (1918--1920). Сборник документов и материалов. В 2-х томах. Минск, 1968, 1971.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Сборник документов и материалов. В 2-х томах. Минск, 1957.





Восстание в Литве и Белоруссии. М., 1965.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941 -- июль 1944). Документы и материалы в 3-х томах. Минск, 1973--1988.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. IX--ХУШ стст. Т. I. Менск, 1936.

Калиновский К. Из печатного и рукописного наследия. Минск, 1988.

Полное собрание русских летописей. Том 32. Белорусско-литовские летописи. М., 1975.

Полное собрание русских летописей. Том 35. Летописи белорусско-литовские. М., 1980.

По воле народа. Из истории образования Белорусской ССР и создания Коммунистической партии Белоруссии. Минск, 1988.

Статут Вялікага княства Літоўскага. Тэксты. Даведнік. Каментарыі. Мінск, 1989.

Абецедарский Л. С. Белоруссия и Россия. Минск, 1978.

Алексеев Л. В. Полоцкая земля. М., 1966.

Антонович В. Б. Монография по истории Западной и Юго-Западной России. Киев, 1885.

Баранова М. П., Загорульский Э. М., Павлова Н. Г. История БССР. Минск, 1990.

Беларусь: Нарысы гісторыі, эканомікі, культурнага і рэвалюцыйнага руху. Пад рэд. А. Сташэўскага, З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага. Менск, 1924.

Бич М. О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861--1904 гг. Минск, 1983.

Власт (Ластоўскі В. Ю.). Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910.

Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. В 3-х томах. Минск, 1983--1985.

Гісторыя Беларускай ССР. У 5-ці тамах. Мінск, 1971--1975.

Греков И. Б. Восточная Европа и упадок Золотой орды. М., 1975.

Греков И. Б., Шахмагонов Ф. Ф. Мир истории. Русские земли в XIII-XУ веках. М., 1986.

Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в

XYI--XYШ вв. Минск, 1975.

Грицкевич А.П. Социальная борьба горожан Белоруссии в XYI--XYШ вв. Минск, 1975.

Довнар-Запольский М.В. Государственное хозяйство Великого княжества Литовского. Киев, 1901.

Довнар-Запольский М.В. Очерки Кривской и Дреговичской земель до конца XП века. Киев, 1891.

Древнерусское наследие и исторические судьбы восточного славянства. М., 1982.

Ермаловіч М.І. Па слядах аднаго міфа. Мінск, 1989.

Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь. Навагародскі перыяд. Гістарычны нарыс. Мінск, 1990.

Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Минск, 1982.

Игнатенко А.П. Борьба белорусского народа за воссоединение с Россией. Минск, 1974.

Иван Федоров и восточно-славянское книгопечатание. Минск, 1984.

Игнатенко И.М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии. Минск, 1986.

Ігнатоўскі У.М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Менск, 1925.

Ігнатоўскі У.М. Гісторыя Беларусі ў XIX -- пачатку XX стст. Менск, 1925.

История Белорусской ССР. Минск, 1977.

История Литовской ССР. Вильнюс, 1978.

Козловский П.Г. Крестьяне Белоруссии во второй половине XYП--XYШ вв. Минск, 1969.

Козловский П.Г. Магнатское хозяйство Белоруссии во второй половине XYШ в. Минск, 1974.

Копысский З.Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XYI -- первой половине XYП вв. Минск, 1975.

Коялович М.О. Литовская церковная уния. СПб., 1864.

Коялович М.О. История русского самосознания. С.-П., 1901.

Круталевич В.А. Рождение Белорусской Советской республики. В 2-х т. Минск, 1975, 1979.

Курс белорусоведения. М., 1920.

Лаппо И.И. Великое княжество Литовское. За время заключения Люблинской унии до смерти Стефана Батория (1569--1586 гг.). С.-П., 1901.



Лаппо И.И. Западная Россия и ее соединение с Польшей. Прага, 1924.

Любавский М.К. Очерк истории Литовско-Русского государства до Люблинской унии включительно. М., 1915.

Любавский М.К. Основные моменты истории Белоруссии. М., 1918.

Лосинский Н.Б. Революционно-народническое движение в Белоруссии (1870--1884 гг.). Минск, 1983.

Мальдзіс А.І. Таямніцы старажытных сховішчаў. Мінск, 1974.

Мальцев А.Н. Россия и Белоруссия в середине XYП в. М., 1974.

Мараш Я.Н. Ватикан и католическая церковь в Белоруссии (1569--1795 гг.). Минск, 1971.

Мелешко В.И. Классовая борьба в белорусской деревне во второй половине XYП--XYШ вв. Минск, 1982.

Нарысы гісторыі народнай асветы і педагагічнай думкі ў Беларусі. Мінск, 1968.

Немировский Е.Л. Франциск Скорина: жизнь и деятельность белорусского просветителя. Минск, 1990.

Орехво Н.С. Дела и люди КПЗБ. Минск, 1983.

Пашуто В.Т. Образование Литовского государства. М., 1959.

Пічэта У.І. Гісторыя Беларусі. Частка I. М., 1924.

Пичета В.И. Аграрная реформа Сигизмунда-Августа в Литовско-Русском государстве. Часть I и П. М., 1917.

Пичета В.И. Белоруссия и Литва XY--XYI вв. М., 1964.

Полуян В.А. Революционно-демократическое движение в Западной Белоруссии (1927--1939 гг.). Минск, 1978.

Романов Е.Р. Белорусский сборник. Вып. I-IX. Киев-Вильно-Витебск, 1886--1912.

Революционный путь Компартии Западной Белоруссии (1921--1939 гг.). Минск, 1966.

Самбук С.М. Революционные народники Белоруссии. Минск, 1972.

Самбук С.М. Общественно-политическая мысль Белоруссии во второй половине XIX века. Минск, 1976.

Самбук С.М. Политика царизма в Белоруссии во второй половине XIX века. Минск, 1982.

Седов В.В. Славяне верхнего Поднепровья и Подвинья. М., 1970.

Седов В.В. Происхождение и ранняя история славян. М., 1979.

Смирнов А.Ф. Восстание 1863 г. в Литве и Белоруссии. М.,

1963.

Солошенко В. И. Большевизм в борьбе с мелкобуржуазными партиями в Белоруссии. Минск, 1981.

Сташкевич Н. С. Приговор революции: крушение антисоветского движения в Белоруссии (1917--1925). Минск, 1985.

Страницы истории Компартии Белоруссии: суждения, аргументы, факты. Минск, 1990.

Тарасов К. И. Память о легендах белорусской старины: голоса и лица. Минск, 1984.

Турук Ф. Ф. Белорусское движение. Очерки истории национального и революционного движения белорусов. М., 1921.

Францыск Скарына і яго час. Мінск, 1988.

Шалькевіч В. Ф. К. Калиновский: страницы истории. Минск, 1989.

Цітоў А. К. Градская геральдыка Беларусі. Мінск, 1989.

Улащик Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. М., 1985.

Чатырохсотлецьце беларускага друку. 1525--1925. Менск, 1926.

Этнаграфія беларусаў. Гістарыяграфія, этнагенез, этнічная гісторыя. Рэд. калегія: Бандарчык У. К., Мялешка У. І., Пілiпенка М. Ф. Мінск, 1985.

Штыхов Г. В. Древний Полоцк. Минск, 1975.

Штыхов Г. В. Города Полоцкой земли IX--XIII вв. Минск, 1978.

Юхо І. А. Крыніцы беларуска-літоўскага права. Мінск, 1991.